**Антановіч З.В.**

## СПРАВАЗДАЧЫ АБ СТАНЕ БЕЛАРУСКІХ ПРАВАСЛАЎНЫХ ЕПАРХІЙ ЯК КРЫНІЦЫ ПА АРГАНІЗАЦЫІ СПРАВАВОДСТВА І АРХІЎНАЙ СПРАВЫ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА БЕЛАРУСІ)

Адміністрацыйная структура праваслаўнай царквы падчас уваходжання ў склад Расійскай імперыі была вызначана праз шэраг рэарганізацый. Яны пачаліся ў 1772 г., калі Віцебская, Дзвінская, Полацкая правінцыі адышлі да Пскоўскай праваслаўнай епархіі, а з Магілёўскай, Аршанскай, Мсціслаўскай і Рагачоўскай правінцый была ўтворана Магілёўская, Мсціслаўская і Аршанская епархія з цэнтрам у Магілёве [6, т. 19, арт. 13921, 14141]. Па ўказе ад 10 студзеня 1795 г. у яе ўвайшлі цэрквы і кляштары Полацкай губерні, якія да гэтага часу былі ў складзе Пскоўскай праваслаўнай епархіі, і яна набыла статус Магілёўскага і Полацкага архіепіскапства (з 1797 г. – Беларускага і Магілёўскага) [6, т. 23, арт. 17289]. Паводле ўказа ад 21 лютага 1804 г. епархія была перайменавана ў Магілёўскую і Віцебскую, а ў 1833 г. – у Магілёўскую і Мсціслаўскую, тэрытарыяльныя памеры якой стасаваліся да Магілёўскай губерні [6, т. 28, арт. 21165; 7, т. 8, арт. 6161]. Па ўказе ад 13 красавіка 1793 г. на тэрыторыі трох новых губерняў утваралася новая праваслаўная епархія – Мінская, Ізяслаўская і Брацлаўская. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай тэрыторыя гэтай епархіі пашырылася (Міншчына, Віленшчына, Гарадзеншчына, Валынь і Падолле), што выклікала яе адміністрацыйна-тэрытарыяльную рэарганізацыю: была вылучана самастойная Мінская і Валынская епархія. Указамі ад 6 мая 1788 г. і 4 жніўня 1799 г. межы епархій у Расійскай імперыі прыводзіліся ў адпаведнасць з дзяржаўным адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем (рэарганізацыя не была цалкам ажыццёўлена) [6, т. 22, арт.16658; т. 25, арт. 19070]. Мінская праваслаўная епархія была перайменавана ў Мінскую і Літоўскую (16 кастрычніка 1799 г.). Канчаткова тэрыторыя епархіі сфарміравалася да 1803 г. У яе склад увайшлі тры губерні: Мінская, Віленская і Гродзенская (з 29 паветамі). У 1832 г. была адноўлена Полацкая праваслаўная епархія, якая ахапіла Віцебскую і Віленскую губерні, Зельбургскі павет Курляндскай губерні [7, т. 8, арт. 6161]. Наступная рэарганізацыя праваслаўных епархій адбылася ў 1839 г. пасля далучэння ўніяцкай царквы да праваслаўнай, што адбілася на тэрытарыяльных межах [11, с. 49–51]. Пры гэтым структура кіравання захоўвалася на працягу XIX – пачатку XX ст.

У адміністрацыйным плане епархіі на чале з епіскапамі і кансісторыямі падпарадкоўваліся Сіноду, сярод функцый якога было абагульненне звестак па стане праваслаўнай царквы у імперыі. Сярод дакументаў, якімі ажыццяўлялася камунікацыя паміж падначаленымі ўстановамі і Сінодам вылучаюцца справаздачы аб стане епархій. Гэтыя дакументы мелі вызначаную структуру, якая ўдасканальвалася на працягу іх прадстаўлення. Духоўным рэгламентам прадугледжвалася і ў 1737 г. пацвярджалася, што епіскапы павінны былі дасылаць у Сінод справаздачы аб стане епархіі, у т.л. па арганізацыі справаводства [6, т. 17, арт. 12508]. У мэтах удасканалення справаводства па ведамствах з 1832 г. справаздачы сталі штогадовымі замест паўгадавых [7, арт. 5585]. У якасці дадаткаў да іх далучаліся звесткі пра асоб, якія былі на споведзі, выхаванцах навучальных устаноў духоўнага ведамства, якія не былі размеркаваны, манастырах і манахах, белым духавенстве, ведамасці аб народжаных, шлюбаваных і памерлых [7, арт. 42701]. Акрамя таго, у гістарыяграфіі адзначаецца, што ў гэтых дакументах праяўляўся і асабовы фактар: епіскапы маглі дадаваць асобныя раздзелы або звесткі [9, арк. 48].

Адным з этапаў удасканалення фармуляру справаздач аб стане епархій стаў 1909 г., калі ён складаўся з 10 раздзелаў. У першым характарызаваўся агульны стан епархіі, у тым ліку асабовы склад кансісторыі, духоўных праўленняў, колькасць благачынных. Пры гэтым адзначалася здавальняльнасць выканання імі службовых абавязкаў, асаблівасці гаспадарчага стану, заўвагі, а таксама ўтварэнне і ліквідацыя прыходаў [4, арк. 4–6]. Напрыклад, у Магілёўскай епархіі ў 1908 г. было ўтворана пяць новых прыходаў [4, арк. 17–56]. У другім раздзеле адзначалася колькасць наведа-



Репозиторий ВГУ

ных епіскапам або вікарыем присутных месцаў і манастыроў, асаблівасці, што былі выяўлены падчас іх агляду, у т.л. па арганізацыі справаводства [4, арк. 4–6]. Трэці і чацвёртыя раздзелы былі прысвечаны стану манастыроў і цэркваў, адпаведна. Абавязкова пазначалася узровень нагляду з боку благачынных, наяўнасць шпіталяў і багадзельняў. Пры гэтым у манастырах асобна вылучаўся маральны стан манаства, а ў цэрквах – арганізацыя справаводства. У пятым раздзеле аналізаваўся склад духавенства епархіі і адносіны з прыхаджанамі, стаўленне да іншаверных і стараверaў [4, арк. 4–6]. Адсочванню зменаў ва ўспрыманні прыхаджанамі праваслаўнай царквы прысвечаны шосты раздзел. Напрыклад, магілёўскім епіскапам у 1908 г. было адзначана, што 92 чалавекі змянілі веравызнаўчую прыналежнасць на рымска-каталіцкую, а стараверaў налічвалася каля 29 000, пераважна ў Гомельскім і Сененскім паветах. Увогуле, адзначалася, што сярод прыхаджан распаўсюджана адсутнасць павагі да старэйшых і чужой маёмасці, нецвярозасць і інш. Расла колькасць скасаванняў пры змяншэнні колькасці шлюбаў [4, арк. 39 адв.]. У сёмым раздзеле справаздачы характарызаваліся катэхітычныя прамовы і іх успрыманне прыхаджанамі. Восьмы раздзел быў прысвечаны звесткам пра навучальныя ўстановы пры манастырах і цэрквах. У дзевятым і дзясятым раздзелах прыводзіліся заўвагі і прапановы іх па выпраўленні [4, арк. 4–6]. Таму, гэтыя дакументы можна шырока выкарыстоўваць у даследаваннях унутрыпалітычнага, краязнаўчага, канфесіянальнага, міжканфесіянальнага і іншых кірункаў [1; 9; 10]. Аднак, у фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі яны захаваліся фрагментарна, а іх значны комплекс па ўсіх епархіях Расійскай імперыі захоўваецца ў фондзе 796 "Канцылярыя Сінода" (Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў), што негатыўна адбівалася на іх увядзенні ў навуковы ўжытак да нядаўняга часу [9, с. 46; 10].

Як адзначалася вышэй, асобная ўвага епіскапаў і Сінода належала арганізацыі справаводства. Даследаванне гэтага напрамку дзейнасці кіраўніцтва беларускіх епархій патрабуе ўліку фактараў асабовага, арганізацыйнага і статыстычнага характару, якія адлюстраваны ў справаздачах аб стане епархій. Напрыклад, асабовы фактар (кадравы склад) значна паўплываў на справаводства Магілёўскай епархіі ў пачатку XX ст., калі епіскап хадатайнічаў аб яго рэвізаванні перад стацкім саветнікам В.С. Міралюбавым. Адхіленымі ад выканання абавязкаў былі члены прысутнасці і адначасова загадчыкі сталоў протаіерэй Петрапаўлаўскай царквы Я. Туторскі за неадпаведную арганізацыю справаводства і пратаіерэй Уваскрасенскай царквы Ф. Дзямянцэвіч, які праходзіў па справе аб нястачы маёмасці. Падчас рэвізіі аналагічны лёс напаткаў таксама загадчыка трэцяга стала пратаіерэя Мікалаеўскай царквы М. Плешчаніцкага. Станоўчы водгук быў толькі пра В. Агароднікава. Сакратар, пад кіраўніцтвам якога ажыццяўлялася справаводства ў кансісторыі, калежскі саветнік В. Дабравольскі быў перамешчаны ў Валынскую кансісторыю, а на яго месца прызначаны з Саратаўскай епархіі калежскі асэсар П. Сахараў. Пры гэтым адзначалася, што ўтрыманне кансісторыі складала 22136 руб. 83 кап., але гэтага было недастаткова. Епіскап адзначаў, што пісары атрымлівалі ад 10 да 45 руб., але пры адсутнасці казённых кватэр такі заробак быў ніжэй, чым у іншых установах [4, арк. 17–56].

Арганізацыйныя пытанні ў працы кансісторыі ўключалі тэхналагічнае забеспячэнне. Да яго адносіцца будынак кансісторыі, які для Магілёўскай кансісторыі характарызаваўся як умяшчальны, сухі і цёплы. Акцэнтавалася, што значная частка архіва Магілёўскай кансісторыі змяшчалася ў ніжнім паўпадвальным паверсе, але сухім і бяспечным ад агню [4, арк.17–56]. Праца кансісторыі была ўпарадкавана на падставе Статута духоўных кансісторый і распарадчых дакументаў Сінода, але з улікам асаблівасцей епархій. Так, члены Магілёўскай кансісторыі штодня збіраліся на пасяджэнні ў 10.30 і працавалі да 15 гадзін, акрамя нядзелі і святочных дзён. З кастрычніка па май чыноўнікі і вольнанаёмныя пісары на чале з сакратаром збіраліся ўвечары на 2,5 гадзіны з 18.30 да 21.00. Улетку вечарамі кансісторыя не працавала, але супрацоўнікі канцылярыі прыходзілі на гадзіну раней – у 9.00 [4, арк.17–56]. Адзначаліся складанасці ў арганізацыі працы Полацкай кансісторыі. Так, члены кансісторыі і сакратар спазняліся або пакідалі працу на 1–2 гадзіны. Справы дакладаліся загадчыкамі сталоў, хаця гэта ўваходзіла ў абавязкі сакратара. Журналы і пратаколы вяліся неаператыўна і маглі прадстаўляцца епіскапу са спазненнем звыш месяца [5, арк. 9–13].

У 1812 г. прадпісвалася далучаць да штогадовых справаздач аб стане епархій звесткі пра вырашаныя і нявырашаныя прысутнасцю кансісторыі справы [6, т. 32, арт. 25210]. Напрыклад, у 1860 г. у Полацкай епархіі было распачата і працягвалася справаводствам 1740 спраў, з якіх



Рэпазіторый ВДУ

652 не былі завершаны. Сярод іх справы аб дзейнасці рымска-каталіцкага духавенства, міжканфесіянальных пераходах і стараверах. З атрыманых 6461 дакументаў не было выканана 90. Выходная дакументацыя склала 9270. Пры гэтым адзначаўся рост ліставання [5, арк. 6–7]. Магілёўскай кансісторыяй у 1908 г. было прынята 16542, а адпраўлена – 18930. Унутраны дакументапаток складалі журналы, якіх было 664 (2054 артыкулаў) і пратаколы, якіх было 548. Усяго кансісторыяй распачата 2223 справы, а засталося нявырашаных 539. Пераважна апошнія былі прадстаўлены справамі аб скасаванні шлюбу, пабудове і рамонце цэркваў, унясенні выпраўленняў у метрычныя запісы аб народжаных, шлюбаваных і памерлых. Магілёўскі епіскап таксама адзначаў, што дакументаабарот павялічыўся [4, арк. 17–56].

Прадстаўленыя епархіямі звесткі абагульняліся Сінодам і распаўсюджваліся сярод мясцовага кіраўніцтва царквой для ведама. Напрыклад, у 1886 г. асноўныя заўвагі Сінода ўключалі адсутнасць інструкцый для дзяжурных і адзнак аб выкананні ў журналах і пратаколах пасяджэнняў. У епархіях часам не вяліся рэгістрацыйна-ўліковыя формы дакументаў: рэестры сакрэтных дакументаў і грашовыя рэестры. У настольных дакладных рэестрах адзнакі ўносілі канцылярысты замест загадчыкаў сталоў, што парушала кантроль справаводства. Пры гэтым запісы вяліся недакладна, а справы прадстаўляліся да разгляду несвоечасова і рашэнні па іх былі недастаткова абрунтаваныя. Асабліва запаволена разглядаліся справы аб скасаванні шлюбу і выдачы выпісаў з метрычных кніг [3, арк.59–64].

Такім чынам, справаздачы аб стане епархій з'яўляюцца комплекснымі крыніцамі, якія дазваляюць усебакова характарызаваць не толькі дзейнасць праваслаўнай царквы ў межах гэтых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, і могуць выкарыстоўвацца ў шэрагу напрамкаў сацыялагічных і гістарычных даследаванняў. Яны прыцягваюцца сучаснымі навукоўцамі у працах канфесіянальнага і краязначага характару, але справаводныя і архівазнаўчыя аспекты дзейнасці епархіяльнага кіраўніцтва застаюцца па-за іх увагай. Пры гэтым у справаздачах па епархіях адлюстравана кадравае, тэхналагічнае і арганізацыйнае забеспячэнне справаводства і архіўнай справы, прыводзіцца аналіз праблем і асобныя прапановы па іх выпраўленні. Рэгулярнасць прадстаўлення гэтых крыніц дазволіць прасачыць агульныя тэндэнцыі і выявіць спецыфічныя рысы дзейнасці ўстаноў.

1. Каиль, М. В. Смоленская епархия накануне революции. Документы из отчета о состоянии Смоленской епархии за 1916 г. / М. В. Каиль // Вестник ПСТГУ II: История. История Русской Православной Церкви. – 2010. – Вып. II:3 (36). – С. 102–121.
2. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения / Е. К. Анищенко [и др.] / сост. Ю. Н. Снапковский, Д. Л. Яцкевич. Минск : Беларусь, 2014. – 814 с.
3. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 34.
4. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1, Спр. 139.
5. НГАБ. – Ф. 2531. Воп. 1. Спр. 30.
6. Полное собрание законов Российской империи. Собрание первое : в 45 т. СПб. : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1851.
7. Полное собрание законов Российской Империи. Собрание второе : в 55 т. СПб. : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1884.
8. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 796.
9. Спичак, А. В. Отчеты о состоянии Тобольской епархии 1856–1915 годов: общее и особенное в содержании и оформлении / А. В. Спичак // Научно-технические ведомости СПбГПУ. Гуманитарные и общественные науки. – 2016. – № 4 (255). – С. 44–52.
10. Теплова, В. А. Трансформации церковно-приходской жизни православного населения Полоцкой епархии (1839–1917) / В. А. Теплова // Труды Минской духовной академии. – 2015. – № 12. – С. 161–172.
11. Филатова, Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772 – 1860 гг. / Е. Н. Филатова. Минск : Белорус. наука, 2006. – 192 с.

Репозиторий ВГУ